

**Лапцёнак Ірына Браніславаўна**
Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
дырэктар Інстытута павышэння кваліфікацыі
і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў»

УДК 378.014:008(476)

*І. Б. Лапцёнак*

# Фарміраванне актуальных кампетэнцый кіраўнікоў і спецыялістаў сферы культуры ў працэсе рэалізацыі нацыянальна значных праектаў

*Раскрываюцца напрамкі фарміравання актуальных кампетэнцый кіраўнікоў і спецыялістаў у сферы культуры на прыкладзе разгляду міжнародных культурна-адукацыйных праектаў, арганізаваных Інстытутам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў». Падкрэслена роля розных форм сацыяльна-творчай актыўнасці ў развіцці сістэмы бесперапыннай адукацыі, рэалізацыі вызначальных вектараў культурнай дзейнасці.*

Павышэнне ўзроўню кваліфікацыі кадраў для інавацыйнага развіцця галін эканомікі з'яўляецца не менш актуальным і значным, чым атрыманне асноўнай адукацыі, «...з прычыны дынамікі эканамічнага развіцця, інфармацыйнага характару энвайранментальнага складніка сучаснага соцыуму, імклівых змяненняў, якія адбываюцца ў асноўных сферах прафесійнай дзейнасці»[1] [1, с. 155]. Дадатковая адукацыя дарослых, надаючы імпульс прафесійнай мабільнасці асобы, становіцца важным элементам фарміравання яе творчай актыўнасці як у індывідуальным сэнсе, так і на ўзроўні макрастратэгіі, накіраванай на доўгатэрміновую прадуктыўную дзейнасць.

---

[1] Тут і далей пераклад наш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Урачыстае адкрыццё XXV курса Міжнароднай летняй школы «Нясвіжская акадэмія», Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж», 2019 г.

Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (далей – Інстытут) адзіны ў краіне выконвае рэспубліканскі дзяржаўны заказ па рэалізацыі праграм дадатковай адукацыі дарослых у сферы культуры. Інстытут функцыянуе на аснове пераемнасці традыцый як універсітэта, так і структур, якія ажыццяўлялі навукова- і вучэбна-метадычнае забеспячэнне дзейнасці ў сферы культуры на розных этапах яе развіцця, – Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры, Інстытута беларускай культуры, Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў сферы культуры і мастацтва, Рэспубліканскага метадычнага кабінета па навучальных установах мастацтваў і культуры [2, с. 7–8].

У Інстытуце праходзяць павышэнне кваліфікацыі каля 60 катэгорый кіраўнікоў і спецыялістаў, рэалізуецца перападрыхтоўка па 11 спецыяльнасцях на ўзроўні вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, арганізуюцца навучальныя курсы па актуальных напрамках развіцця сферы культуры, праводзіцца кваліфікацыйны экзамен для педагагічных работнікаў дзіцячых школ мастацтваў у галіне музычнага, эстраднага, тэатральнага, харэаграфічнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну і народнай творчасці. Інстытут ажыццяўляе метадычнае забеспячэнне дзейнасці дзіцячых школ мастацтваў і ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры, праводзіць маніторынг і дыягностыку іх дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння Інстытут працуе як рэсурсны цэнтр у галіне дадатковай адукацыі дарослых у сферы культуры. Яго супрацоўнікі актыўна ўдзельнічаюць у вырашэнні праблем культурнай палітыкі, распрацоўваюць праекты дзяржаўных праграм, нарматыўных прававых актаў, ажыццяўляюць арганізацыйна-метадычную падтрымку ўстановам культуры. Інстытут з'яўляецца звяном, якое звязвае практыку і яе метадычнае асэнсаванне, служыць перадумовай эфектыўнай работы галіны. У ажыццяўленні адукацыйнай дзейнасці выкарыстоўваюцца рэзервы яго структурных падраздзяленняў (аддзелаў адукацыйных праектаў і сувязей з грамадскасцю, інфармацыйна-аналітычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых, вучэбна-метадычнага забеспячэння дзейнасці ўстаноў адукацыі ў сферы культуры), а таксама патэнцыял інфармацыйных рэсурсаў, якія вядзе Інстытут, – дзяржаўнай інфармацыйнай сістэмы «Інтэграваны банк даных устаноў культуры», аўтаматызаванай сістэмы цэнтралізаванага ўліку «Банк даных таленавітай моладзі», сайта «Жывая спадчына Беларусі: інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны», інтэрнэт-партала «Вяртанне», базы даных «Дзяржаўны рэгістр фільмаў».

Аснова для ўдасканалення адукацыйнага працэсу ў Інстытуце – інтэграцыя навукова-даследчай, вучэбнай і практычнай дзейнасці, цесная сувязь з рэгіянальнымі ўстановамі культуры, актыўнае выяўленне, абагульненне і распаўсюджанне эфектыўных методык.



Урачыстая цырымонія адкрыцця II Еўрапейскіх гульняў, фрагмент «Легенды і паданні», г. Мінск, 2019 г.

Асаблівай формай арганізацыі інавацыйнай актыўнасці слухачоў стала правядзенне практычных заняткаў, майстар-класаў, круглых сталоў на базе спецыялізаванай аўдыторыі «Этналабараторыя» з выкарыстаннем калекцыі музычных інструментаў з 15 краін свету, запісаў фальклорных экспедыцый, этнаграфічных матэрыялаў, сабраных І. І. Кірчуком. Фонды этналабараторыі ўжываюцца як падчас мерапрыемстваў, зладжаных у Інстытуце, так і на іншых пляцоўках. На ўрачыстай цырымоніі адкрыцця II Еўрапейскіх гульняў у Мінску ў музычна-сцэнічным суправаджэнні арыгінальнай кампазіцыі ў эпізодзе «Легенды і паданні», створанай у стылі маштабнага лялечнага тэатра, выкарыстаны матэрыялы сцэнарыяў, музычныя інструменты і ўзоры касцюмаў з этналабараторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інстытута. Новыя функцыянальныя магчымасці аўдыторыі пасля яе мадэрнізацыі ў 2020 г. (сінтэз экспазіцыі і інтэрактыўнага прымянення аб'ектаў паказу; наяўнасць імправізаванай тэатральнай сцэны для міні-спектакляў з выкарыстаннем лялечнага тэатра «Батлейка»; авансцэны для студыйнай работы) будуць прыменены для павышэння прафесійнага майстэрства такіх катэгорый спецыялістаў, як педагагічныя работнікі ў галіне музычнага і тэатральнага мастацтва, кіраўнікі аматарскіх аб'яднанняў, клубныя і музейныя супрацоўнікі, фалькларысты і інш.

Да інавацыйных практык, якія спрыяюць фарміраванню інтэграцыйнай і інтэрактыўнай адукацыйнай сферы, належыць арганізацыя ў Інстытуце каворкінг-прасторы для слухачоў, якая ўяўляе сабой зручнае месца для працы і правядзення тэматычных сустрэч з прафесіяналамі на базе чытальнай залы бібліятэкі. Абсталяваная высакахуткасным Інтэрнэтам і зонай для праектна-творчага ўзаемадзеяння, яна спрыяе стварэнню атмасферы крэатыўнасці і павышэнню сінергетычнага эфекту адукацыйнага асяроддзя.

Важнае значэнне набывае стварэнне ўмоў для развіцця крэатыўнай інаватыкі праз удзел у рэалізацыі актуальных сацыяльна значных практыка-арыентаваных праектаў, у тым ліку міжнароднага фармату. Згодна з Нацыянальнай стратэгіяй устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2030 года, прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці ў сферы культуры, якія абумоўліваюць змест дадатковай адукацыі, з'яўляюцца: 1) захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей нацыянальна-культурнай самабытнасці і традыцый; 2) інтэграцыя беларускай культуры ў сусветную; 3) усямерная падтрымка таленавітай моладзі ў рэалізацыі новых ідэй і творчых праектаў; 4) сістэмная рэпрэзентацыя культурнага прадукту і інш. [3, с. 39–40].

З мэтай даследавання праблем інклюзіўнай адукацыі ў сферы культуры, у сістэме дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, дадатковай адукацыі дарослых, Інстытут далучыўся да ажыццяўлення міжнароднага праекта «ОбРаз – образование и развитие инклюзивного искусства», арганізатарам якога выступае Нацыянальны цэнтр творчага развіцця і інклюзіі «ShareMusic & Performing Arts» (Швецыя). Педагагічныя работнікі сферы культуры ўзялі ўдзел у складзе фокус-групы Інстытута ў серыі адукацыйных семінараў, майстар-класаў, круглых сталоў, падчас якіх абмеркаваны ўнікальныя праекты, створаныя на аснове эфектыўнага рэспубліканскага і міжнароднага вопыту, адметныя метады працы ў інклюзіўных групах.

Фарміруючы актыўнае адукацыйнае асяроддзе, Інстытут рэалізуе асаблівы для сферы культуры вектар, накіраваны на вывучэнне, захаванне і папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны. «Нясвіжская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

акадэмія» – адна з найстарэйшых міжнародных летніх школ у Беларусі, якая атрымала шырокую вядомасць па-за межамі краіны. Праект дзейнічае на працягу дваццаці пяці гадоў і ўяўляе сабой унікальны прыклад беларуска-польскага ўзаемадзеяння ў сферы культуры, якое рэалізуецца Інстытутам у сумеснай працы з Нацыянальным інстытутам спадчыны (Рэспубліка Польшча). Мэта стварэння і дзейнасці «Нясвіжскай акадэміі» – удасканаленне прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў з Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (Беларусь, Літва, Латвія, Украіна, Малдова, Расія і Польшча) у галіне ландшафтна-паркавай архітэктуры, аховы і рэстаўрацыі гістарычных сядзібных і палацавых комплексаў, помнікаў абарончай, сакральнай архітэктуры і інш. Праграмы школы маюць міждысцыплінарны характар, аб'ядноўваюць больш за 10 напрамкаў.

У межах двухгадовых курсаў праходзяць навучанне работнікі ўпраўленняў (аддзелаў) культуры абласных і раённых выканаўчых камітэтаў, якія адказваюць за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны ў рэгіёнах; спецыялісты ўпраўленняў (дэпартаментаў) па ахове спадчыны міністэрстваў культуры; музейныя супрацоўнікі, што займаюцца кансервацыяй, рэстаўрацыяй і захаваннем калекцый і аб'ектаў; архітэктары; рэстаўратары і інш. У працэсе навучання адбываецца:

– абмен досведам у сферы захавання гісторыка-культурнай спадчыны;

– вывучэнне методык выканання навукова-даследчых, кансервацыйных і рэстаўрацыйных работ;

– распрацоўка канцэпцый па ўключэнні аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў турыстычны ўжытак і іх музеефікацыі.



Рэктар БДУКМ А. А. Корбут і дырэктар Нацыянальнага інстытута спадчыны Б. Скалдоўскі на цырымоніі ўручэння дыпломаў XXIII курса Міжнароднай летняй школы «Нясвіжская акадэмія», Каралеўскія Лазенкі (Рэспубліка Польшча), 2018 г.

Першы этап навучання праходзіць у форме майстар-класаў у Беларусі. Другі этап арганізаваны як стажыроўка на тэрыторыі Польшчы. Тэарэтычныя і практычныя заняткі праводзяцца як у вучэбных аўдыторыях, так і непасрэдна на аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны. Па выніках удзелу слухачы, якія паспяхова выканалі праграму і абаранілі праект, атрымліваюць міжнародны сертыфікат.

Навучанне ў «Нясвіжскай акадэміі» адбываецца пад кіраўніцтвам вучоных і спецыя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лістаў-практыкаў, якія маюць трывалыя навыкі аналізу і мадэлявання гісторыка-культурнага і прыроднага ландшафту, распрацоўкі і вядзення праектаў рэстаўрацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей на нацыянальным і міжнародным узроўнях. У рэалізацыі праграм актыўна ўдзельнічаюць эксперты з Нацыянальнага інстытута спадчыны Рэспублікі Польшча, Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры і Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, ААТ «Белрэстаўрацыя», ГА «Беларускі камітэт "ICOMOS"», архітэктурна-мастацкага савета Беларускага Экзархата, сумеснай Беларуска-Польскай кансультатыўнай камісіі па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка і інш.

За гады існавання праекта ў Міжнароднай летняй школе «Нясвіжская акадэмія» прайшлі навучанне больш за 300 чалавек з 7 краін – Беларусі, Латвіі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Расіі, Украіны. Праца «Нясвіжскай акадэміі» высока ацэньваецца краінамі-ўдзельніцамі. Дыпломныя работы шасці слухачоў з Беларусі, прадстаўленыя на Міжнародным конкурсе імя Яна Захватовіча, атрымалі першыя прэміі. Праект вызначаны як адзін з найбольш эфектыўных сярод міжнародных адукацыйных праграм, што дакументальна засведчана на пасяджэннях сумесных кансультатыўных міждзяржаўных камісій.



Справаздачны канцэрт лаўрэатаў, стыпендыятаў і дыпламантаў
спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
па падтрымцы таленавітай моладзі, г. Мінск, Белдзяржфілармонія, 2014 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важным напрамкам дзейнасці Інстытута з'яўляецца арганізацыя і правядзенне культурна-адукацыйных мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю дасягненняў навучэнцаў устаноў адукацыі сферы культуры, лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Пры непасрэдным удзеле Інстытута сфарміравана і паспяхова функцыянуе ўнікальная сістэма па выяўленні, выхаванні і падтрымцы маладых талентаў – важнага стратэгічнага рэсурсу дзяржавы.

Адзін з найбольш значных беларуска-расійскіх праектаў у сферы культуры – майстар-класы «Союзное государство – молодым талантам XXI века». На працягу дзевяці гадоў гэты праект уваходзіць у пералік абавязковых мерапрыемстваў у межах культурнай праграмы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі. Інстытут вядзе працу па арганізацыі майстар-класаў з 2009 г. За гэты час у іх узялі ўдзел больш за 900 юных музыкантаў і мастакоў з розных рэгіёнаў Расіі і Беларусі.



Заключны канцэрт на XIV адкрытых маладзёжных Дэльфійскіх гульнях дзяржаў – удзельніц СНД, с. Раждзествена Маскоўскай вобл. (Расійская Федэрацыя), 2019 г.

Унікальным можна назваць камунікатыўны і пазнавальны вопыт арганізацыі ўдзелу беларускай дэлегацыі ў Дэльфійскіх гульнях – міжнародных спаборніцтвах у сферы культуры па намінацыях конкурснай і фестывальнай праграмы. Ацэначныя камісіі Дэльфійскіх гульняў прадстаўляюць больш за сто вядомых дзеячаў мастацтва. У адборачных турах праекта, як правіла, бяруць удзел каля 600 тысяч канкурсантаў, і таму лічыцца, што перамога на Дэльфійскіх гульнях – гэта міжнародны атэстат прафпрыдатнасці. Мерапрыемства павышае цікавасць моладзі да нацыянальнай культуры, садзейнічае прафесійнаму росту выканаўцаў,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэалізацыі іх творчых здольнасцей. На працягу 18 гадоў Інстытут вызначае намінацыі і праводзіць адбор удзельнікаў, якія прадстаўляюць Беларусь.

Яркай культурнай падзеяй з'яўляецца Рэспубліканская мастацкая выстава работ лаўрэатаў, стыпендыятаў і дыпламантаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Для большасці ўдзельнікаў гэта першы значны крок у творчай біяграфіі, стымул для новых перамог. Выстава дае выдатную магчымасць не толькі выявіць новыя маладыя таленты, але і прасачыць за развіццём тых, хто быў уганараваны раней.

Рэалізацыя нацыянальна значных культурна-адукацыйных праектаў садзейнічае развіццю прафесійных кампетэнцый кіраўнікоў і спецыялістаў, стварэнню сістэмы ўнутранай матывацыі прафесарска-выкладчыцкага складу ўстаноў адукацыі сферы культуры да распрацоўкі, увядзення і засваення сучасных адукацыйных тэхналогій, інтэрактыўных методык, індывідуальных траекторый навучання. Адукацыйныя праекты, культурныя мерапрыемствы і творчыя акцыі, якія праводзяцца Інстытутам, на працягу многіх гадоў спрыяюць развіццю крэатыўнай інаватыкі ў сферы культуры, даюць імпульс да прымнажэння культурных традыцый, захавання і развіцця нацыянальнай культуры, садзейнічаюць фарміраванню пазітыўнага іміджу Беларусі ў свеце.

1. *Лаптенок, И. Б.* Особенности внедрения инноваций в дополнительное образование взрослых / И. Б. Лаптенок // Инновационные процессы и корпоративное управление : материалы X Междунар. заочной науч.-практ. конф., Минск, 15–31 марта 2018 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: В. В. Апанасович (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2018. – С. 154–159.

2. *Лапцёнак, І. Б.* Дадатковая адукацыя дарослых у сферы культуры ў кантэксце сучасных адукацыйных трэндаў / І. Б. Лапцёнак // Сучасная дадатковая адукацыя дарослых у сферы культуры : навукова-метадычнае забеспячэнне і павышэнне якасці адукацыі / уклад. І. Б. Лапцёнак ; рэдкал.: І. Б. Лапцёнак (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 3–12.

3. Национальная стратегия социально-экономического развития Республики Беларусь до 2030 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://economy.gov.by/ru/dejst_prognoz_dok-ru/. – Дата доступа: 15.04.2020.

*I. Laptsionak*

**Formation of relevant competencies of leaders and specialists in the field of culture in the implementation of nationally significant projects**

*Directions of formation of relevant competencies among leaders and specialists in the field of culture on the example of international cultural and educational projects organized by the Institute of professional development and personnel retraining of the Belarusian State University of Culture and Arts are revealed. Based on their analysis, the role of various forms of social and creative activity in the development of the system of lifelong education, and the implementation of the vectors of cultural activity is determined.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 25.05.2020.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ